# Дзесяць гадоў знакавым аб'ектам




Скульптар Вадзім Мацкевіч у час устаноўкі Пасажыркі.

**У дні XX Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна–2021» са сцэны Летняга амфітэатра ў парку Перамогі неаднаразова гучалі словы пра тое, што сёлета спаўняецца дзесяць гадоў знакавым гарадскім аб'ектам. Гадзіннік на вуліцы Прытыцкага адлічвае ўсё новы час...**

## «Зробленае застанецца»

Восенню 2011 года ў Маладзечне прайшоў Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Змены да яго правядзення адбываліся грандыёзныя. Добраўпарадкоўваліся вуліцы, рамантаваліся дамы, уводзіліся ў строй новыя аб'екты сацыяльна-культурнай сферы, нават вырас новы 11-ы мікраараён «Усходні». Карэспандэнты нашага выдання расказвалі пра тое, як ідзе падрыхтоўка да свята, якія сілы задзейнічаны. Адным з загалоўкаў мясцовай газеты быў такі: «Зробленае застанецца». Вядома ж, засталося, а мы сёння і ўявіць не можам Маладзечна без спартыўна-забаўляльнага цэнтра, Летняга амфітэатра ў парку з воднай феерыяй і стыльнымі ратондамі. Мы прызвычаіліся да камфорту і прыгажосці навокал, госці горада атрымліваюць прыемныя ўражанні ад знаёмства з ім. Дзякуючы фотаархіву нашай газеты ёсць магчымасць успомніць пра тое, з чаго ўсё пачыналася.

Генеральны падрадчык ААТ «Спецбудмеханізацыя» нёс асноўную нагрузку пры ўзвядзенні многіх аб'ектаў. Разам са спецыялістамі субпадрадных арганізацый калектыў працаваў на будаўніцтве мікраараёна «Усходні», рэканструкцыі гарадскога парку.

Дзякуючы майстэрству і зладжанай рабоце будаўнікоў ТАА «БФ «Барыт» узвядзенне Летняга амфітэатра было праведзена ў шасцімесячны тэрмін. Сцэнічная гляцоўка, якая нагадвае крылы гіганцкага матылька, арганічна ўпісалася ў ландшафтны паркавы дызайн.

Каб водная феерыя радавала вока, давялося нямала папрацаваць. Работу фантана на Цэнтральнай плошчы і двух на ніжнім возеры ў парку цяпер забяспечвае КУП «Маладзечнаводаканал». Аб'ём вады ў паркавых азёрах і ручаі складае каля 27 тысяч кубаметраў. Са стацыянарнага фантана на ніжнім возеры вада б'е на вышыню 15 метраў.

## Вобразы ў бронзе

Дзесяць гадоў таму ў нашым горадзе з'явілася некалькі скульптур. З боку Мінска гасцей сустракае манументальная стэла «Пакроў Прасвятой Багародзіцы» работы Аляксандра Фінскага. На Старым Месце «прапісаўся» бронзавы Вястун з граматай у руках ад князя Дзімітрыя Карыбута князю Ягайлу з першым афіцыйным упамінаннем пра Маладзечна (аўтары Уладзімір Жбанаў, Яраслаў Філіповіч). Ён устаноўлены там, дзе пачалося жыццё горада. Яшчэ адна работа Уладзіміра Жбанава скульптара — фантан «Залаты трыліснік» на Цэнтральнай плошчы.

На чыгуначным вакзале мы бачым усім вядомую Пасажырку. Прыгожая дзяўчына нібыта толькі выйшла з цягніка. Магчыма, студэнтка вярнулася пасля вучобы ў родны горад. На яе чамадане сядзіць кацяня. Ёсць меркаванне, што яно сімвалізуе ўтульнасць дома, які пакінула студэнтка, калі адправілася на прасторы жыцця. На тое, што адбываецца побач, Пасажырка глядзіць з вышыні свайго росту, а гэта 196 сантыметраў. Вага бронзавай скульптуры 450 кілаграмаў. Яе аўтар — скульптар Вадзім Мацкевіч.

## Цэнтр спартыўнага жыцця

Спартыўна-забаўляльны цэнтр стаў шырока вядомы ў нашай краіне яшчэ на стадыі будаўніцтва. Узвялі яго будаўнікі ААТ «Будтрэст №3 ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі» г. Салігорска.

У сучасным комплексе створаны належныя ўмовы для заняткаў рознымі відамі спорту, карыснага адпачынку ўсёй сям'ёй. У яго склад уваходзіць лядовая арэна больш чым на дзве тысячы гледачоў. У Лядовым палацы праводзяцца хакейныя матчы, спаборніцтвы рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, спартакіяды.

**Людміла ЦАР.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**



Так выглядаў Летні амфітэатр.



Гадзіннік на вуліцы Прытыцкага.



Будуецца мікраараён «Усходні».



Спартыўна-забаўляльны цэнтр з вышыні птушынага палёту.